рительную борьбу, где единственным результатом было финансовое и военное истощение обоих родов, что в будущем послужило на пользу Люксембургскому дому. В результате интриг папской курии и недовольства князей Германии политикой Людвига Баварского часть немецких курфюрстов в Рензе провозгласили новым королем Германии Карла Люксембурга (1346 г.), которого многие историки, в том числе и М.А. Бойцов, характеризуют «как самого значительного государя XIV–XV вв.»[6]. Действительно, при Карле IV (1346–1378 гг.) наблюдается заметное усиление власти короля в Германском государстве, которое произошло благодаря тому, что Люксембурги к этому времени имели огромные территории, простиравшиеся от Верхнего Пфальца до Силезии и от Западной Померании до Австрии. Карл IV видел в них основу своего владычества и ресурсы для осуществления властных полномочий. На этой территории королевская власть являлась важной жизненной силой, способной решать проблемы внутреннего и внешнего развития.

С правлением Карла IV связано начало эволюции империи в качестве федеративного феодального государства, которое получило свое юридическое оформление в изданной Люксембургом в 1356 г. Золотой булле. Булла закрепила новое политическое развитие в государстве на основе признания формальных прав верховной власти при всемогуществе контролировавших ее князей-избирателей, а также зафиксировала значительную автономию княжеской власти, так как князьям было отдано верховенство в их владениях, сделавшее их подлинными хозяевами своих земель. Юридически было закреплено положение о том, что 7 курфюрстов (архиепископы Майнцский, Трирский, Кельнский, пфальцграф Рейнский, король Чехии, герцог Саксонский, маркграф Бранденбургский), образующих особую коллегию, выбирают немецкого короля и вместе с ним представляют королевскую власть.

Роль Золотой буллы для истории Германии неоднозначна. С одной стороны, она закрепила олигархию крупных феодалов в немецком государстве, сложившуюся задолго до этого акта, и политическую раздробленность страны, значительно умерила власть короны. С другой стороны, новая избирательная система содержала и позитивные государственно-правовые тенденции. С помощью Буллы к концу XV в. королевская власть в Германии приобрела значительную устойчивость, но за счет вытеснения на восточную периферию империи, что еще раз подтверждает территориально-княжеский характер власти короля со времени междуцарствия.

[1] См.: Брайс Дж. Священная Римская империя. М.,1891.С. 170.
[2] Там же. С. 171.
[3] Колесницкий Н.Ф. Проблема возникновения территориальной раздробленности в Германии (XI–XII вв.) в немецкой историографии // Проблемы германской истории. Вологда, 1973. Вып. 2. С. 180.
[4] Лампрехт К. История германского народа. М., 1895. Т. 2. С. 380.
[5] Там же. С. 338.
[6] Бойцов М.А. Золотая булла 1356 г. и королевская власть в Германии во второй половине XIV в. // Средние века. М.,1989. Вып. 52. С. 25.

*І.А. ЕУТУХОУ*

## АДЛЮСТРАВАННЕ ПОЗНЕАНТЫЧНАГА МЕНТАЛІТЭТУ Ў ПЕРАПІСЦЫ СІМАХА І ПРЭТЭКСТАТА

Ветыцый Агорый Прэтэкстат (пам. 384 г.) быу адной з ключавых фігур у палітычным жыцці заходняй часткі Рымскай імперыі – праконсул Ахайі (361 г.), прэфект Рыма (367–368 гг.), удзельнік пасольства сената да імператара Валентыніяна (Amm. XXVIII, 1), прэфект прэторыя (384 г.), квіндэцэмвір, аугур, пантыфік Весты[1]. Гэты чалавек, па словах Аміяна, арганічна аб'ядноувау у сваёй асобе высакародны лад думак і рымскую ганарлівасць (Amm. XXII, 7, 6).



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Комплекс перапіскі Сімаха і Прэтэкстата складаецца з 12 лістоў (I, 44–55)[2], якія папярэдне, хаця і з дастатковa вялікай ступенню суб'ектыўнасці, могуць быць размеркаваны па двух умоўных групах па храналагічных і стылістычных прызнаках: 1) лісты 376–378 гг. (I, 44, 49, 50, 52), 2) лісты 380–385 гг. (I, 45–48, 51, 53–55). Пры першым чытанні ў больш ранніх лістах адчуваецца сяброўскі характар перапіскі з прыметным адценнем афіцыйнасці, у больш позніх – сяброўскі характар, блізкі да амікашонства.

Праведзены аналіз паказвае, што комплекс лістоў Сімах – Прэтэкстат займае прамежкавае становішча паміж комплексамі перапісак: сяброўскай – Сімаха з Аўсоніем і дзелавой – Сімаха з Пробам. Аналіз дазваляе не толькі ўдакладніць высновы, якія былі зроблены раней, але і прасачыць пэўную дынаміку (пераход ад афіцыйнага тону да сяброўскага) у міжасабовых адносінах прадстаўнікоў заходнерымскай нехрысціянскай арыстакратыі.

Афіцыйны характар у комплексе мае ліст сорак дзевяты, дзе Сімах выконвае ролю інфарматара («... Вы просіце ў мяне самых дакладных навін пра гэтую трывожную сітуацыю»). Ён вельмі дэталёва паведамляе пра ахвяры багам і іх вынікі (у дадзеным прыкладзе вынікі былі адмоўныя, таму ахвярапрынашэнні працягваліся), а таксама гарантуе прадстаўленне аператыўнай інфармацыі пры магчымым змяненні сітуацыі ў лепшы бок (I, 49).

Афіцыйны характар з адценнем сяброўскіх адносін маюць сорак чацвёрты і пяцьдзесят другі лісты, першы з якіх выконвае суправаджальную ролю ліста да прамовы Сімаха Pro Trygetio ў рымскім сенаце (9 январыя 376 г.), другі – мае падзяку за выказаную Прэтэкстатам станоўчую ацэнку.

Сюжэтная лінія сорак чацвёртага ліста выглядае наступным чынам. У самым пачатку Сімах уключае свайго адрасата ў найбольш блізкае кола зносін. Потым ідзе дэталёвае апісанне падзей, якія прывялі ўрэшце рэшт да выступлення ў сенаце. У заключэнні Сімах просіць Прэтэкстата даць ацэнку прамове (I, 44).

Пры азнаямленні з матэрыялам складваецца ўражанне, што тут чытач мае справу са звычайнай кампліментарнасцю. Сама па сабе пазіцыя Прэтэкстата не вельмі цікавая, яна прадказальна станоўчая і адназначна наканоўваецца пачаткам ліста, дзе згадваецца пра шматлікія віншаванні, якія паступаюць апошнім часам на адрас Сімаха і чуткі пра якія ўжо дасягнулі Прэтэкстата. Аналагічную мэту мае і заканчэнне ліста, дзе ёсць спасылка на меркаванні, ужо выказаныя сенатам.

Дадзеная выснова, аднак, мае толькі характар папярэдняй ацэнкі. З улікам назірання Джона МакГечы пра тое, што копіі прамовы Pro Trygetio былі таксама накіраваны Сіагрыю, Юліяну і Нестэрыю[3], можна меркаваць, што гаворка тычыцца не столькі кампліментарнага пацвярджэння станоўчага водгуку сената, колькі публічнай ратыфікацыі сваёй прыналежнасці да пэўнага кола людзей.

Аб тым, што азначаная ратыфікацыя адбылася, сведчыць наступны тэзіс Сімаха з пяцьдзесят другога ліста: «Тое, што мая прамова Вам вельмі спадабалася, радуе мяне не менш за добразычлівую думку сената, гэтай лепшай часткі роду чалавечага, калі ён яе пачуў» (I, 52).

Аднак узнікае цалкам прыроднае пытанне пра мэтанакіраванасць ратыфікацыі, звязанай з тым, што да складу рымскага сената ўваходзілі не толькі прыхільнікі традыцыйнага веравызнання, але і хрысціяне. Успрыняцце сенатараў цалкам як эліты чалавецтва дазваляе вызначыць больш вузкае кола як «эліту эліты», ці сапраўдную рымскую арыстакратыю. Ускосным аргументам на карысць выказанаму меркаванню служыць прыведзеная вышэй ацэнка Прэтэкстата, дадзеная Аміянам Марцалінам.

Вылучэннем спачатку «эліты чалавецтва», потым «эліты эліты» працэс усталявання сяброўскіх адносін не заканчваецца. Яго апошнім этапам стане персаніфікацыя, аб якой сведчыць пяцідзесяты ліст Сімаха, апошні з ранняга перыяду.

У гэтым пасланні Прэтэкстат атрымлівае ад свайго візаві заўвагу за тое, што адрасаваў ліст адначасова і Сімаху, і яго бацьку: «... Вы адправілі



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

толькі адно пасланне майму бацьку і мне, і, звыш таго, ліст вельмі кароткі» (I, 50, 1). Сімах у прынцыпе быў згодны з прапанаванай мадэллю паводзін, якая, відавочна, уключала яго разам з бацькам да складу «эліты эліт»: «Вы мне скажыце, што для (майго) гонару было б важна, каб я быў аб'яднаны са сваім бацькам. Безумоўна, ёсць рэчы, якімі б я жадаў карыстацца альбо разам з маім бацькам, альбо на роўных з ім» (Ibid. 2). Пры гэтым Сімах настойліва праводзіць лінію на неабходнасць большай вызначанасці і дакладнай персаніфікацыі сяброўскіх адносін: «...Любоў да мяне павінна быць накіравана на маё імя» (Ibid.).

Пэўны паварот у адносінах паміж Сімахам і Прэтэкстатам ва ўмацаванні іх сяброўскіх адносін назіраецца ў пяцьдзесят чацвёртым лісце, дзе Сімах выказвае свайму адрасату шчырую падзяку за выяўленыя ім шкадаванні ў сувязі са смерцю брата. Прычым у лісце спецыяльна падкрэслівалася вялізарнае значэнне паслання для аднаўлення душэўнай раўнавагі (I, 54).

Астатнія лісты 80-х гг. рэпрэзэнтуюць шырокі псіхолага-эмацыянальны спектр сяброўскіх адносін, у якіх выказваюцца шчырыя шкадаванні ў сувязі з цяжкай хваробай яго жонкі. Калі зыходзіць з надпісу на помніку, яна займала віднае месца ў шматлікіх рымскіх містэрыяльных культах: «Фабіі Аконіі Пауліне, святлейшай матроне, дачцэ Акона Катуліна, святлейшага мужа, былога прэфекта і ардзінарнага консула, жонцы Веція Прэтэкстата, святлейшага мужа, прэфекта і абранага консулам, прысвечанай у Элеусіне ў містэрыі бога Вакха, Цэрэры і Коры, прысвечанай у Лерне ў містэрыі бога Лібера, Цэрэры і Коры, прысвечанай на Эгіне ў сакраменты багінь, жрыцы таўраболій, жрыцы Ісіды, іерафантрыі багіні Гекаты і шануемай грэкамі багіні Цэрэры» (Dess. № 1260). Рэлігійная дзейнасць Пауліны дазволіла Сімаху падкрэсліць, што яна аднолькава дарагая ім абодвум (I, 48).

У пяцьдзесят першым лісце (383 г.) можна адшукаць папрокі на адрас Прэтэкстата ў сувязі з яго самаўхіленнем ад палітычнай актыўнасці. Больш таго, Сімах лічыць магчымым супрацьпаставіць дзве мадэлі паводзін. Ён асабіста адкінуў усе свае планы, тэрмінова вярнуўся ў Рым: «Пры агульнай бядзе мой спакой падаўся мне ганебным», – і прызваў, каб Прэтэкстат зрабіў таксама (I, 51). Ліст пяцьдзесят чацвёрты, напісаны ў наступным 384 г., сведчыць пра выхад сябра на роўнаўплывовыя ролі ў дуэце. Ад папрокаў Сімах пераходзіць да праўядзення самастойнай лініі. На фоне традыцыйных і абавязковых запэўніванняў у шчырым сяброўстве гучыць адмова скарыстацца яго парадамі наконт прымірэння з адным з іх агульных знаёмых.

Пра значную ступень самастойнасці Сімаха сведчыць і яго пераход на ментарскі тон: «Мне не падабаецца адчуваць недахоп у квяцістых выразах: той, хто піша коратка, хутчэй выяўляе сваю пагарду, чым ветлівасць. Я не жадаю такіх лістоў, якія па кроплі раняюць словы з вуснаў, якія ледзьве рухаюцца» (I, 45, 1); «Калі толькі ў лясах ты не наведваеш Апалона, як гэта рабіў калісьці пастух Гесіод, якога увянчалі паэтычнымі лаўрамі Музы. Адсюль, магчыма, (паходзіць) гэты архаічны стыль, які ў тваіх лістах спалучаецца з сучаснымі думкамі. Быццам ты, пазабыўшы пра забавы больш шляхетныя, цікавішся толькі вузламі сетак, пер'ямі пудзіл, нюхам сабак, карацей кажучы, усімі прыёмамі псовага палявання. Таму, калі ты будзеш мне пісаць, помні пра тое, каб стрымаць сваё красамоўства. Няхай твая мова будзе простай і нявымушанай дзеля таго, каб цябе не прынялі за паляўнічага» (I, 53, 2). Наступны ж фрагмент ліста сорак сёмага можна ўспрымаць як лёгкі здзек: «Я не сцвярджаю, што ты заплываеш тлушчом падчас вакацый і што твае асалоды ахладзілі тваю доблесць» (I, 47, 2).

Асобае месца ў комплексе перапіскі Сімах – Прэтэкстат належыць лісту сорак шостаму, які дазваляе унесці дастаткова значныя ўдакладненні ў агульную схему цыркулявання інфармацыі, сфармуляванай на падставе аналізу перапіскі Сімаха з Аусоніем і Пробам.

Комплекс Сімах – Аусоній паказаў, што інфармацыя павінна быць: 1) аператыўнай, 2) дакладнай і зыходзячай ад першай асобы, 3) не быць



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

празмернай. Комплекс Сімах – Проб дапауняе да дадзенай схемы яшчэ адну рысу – выяўленне лаяльнасці да дзяржаўнай улады на усіх яе узроўнях.

Аналізуемы ліст дазваляе удакладніць апошнія дзве характарыстыкі. У комплексе Сімах – Аусоній абмежаванне аб'ёму передаваемай інфармацыі выступае вынікам пэўных псіхалагічных варункаў: трэба пазбегнуць празмернай загрузкі сяброў сваімі праблемамі. У лісце сорак шостым ідзе прамая гаворка пра падзел інфармацыі на пісьмовую і вусную: «Я не буду выкладаць у гэтым пасланні усё дзеля таго, каб майму брату яшчэ засталося, пра што цябе распавесці. Даведайся ж пра сутнасць праблемы і асноўныя моманты справы, а ён дэталёва адкажа табе на пытанні» (I, 46, 1).

З наступнага тэксту ліста можна бачыць, што да адкрытай (афіцыйнай, ці фіксуемай у пісьмовай форме) інфармацыі адносяцца вельмі агульныя тэзісы пра рэлігійную практыку рымскага жрэцтва, якія у прынцыпе не выклікаюць адмоўнага стаўлення імператара-хрысціяніна: важнасць рытуалаў, рашэнне пра наданне культавым дзеянням публічнага характару, інфармацыя пра арганізацыю шыкоўных свят.

Застаецца невядомым, што менавіта з гэтых тэзісаў і у якім кірунку будзе дапаўняцца закрытай (канфедыцыяльнай, ці вуснай) інфармацыяй. Хаця сам факт таго, што перадача адбудзецца, у лісце фіксуецца так: «Я загадаў ...каб ён расказаў табе усё, пра што ты пажадаеш даведацца» (Ibid. 2). У самых агульных рысах паведамляецца пра асноўны змест будучага абмеркавання: «Калі ты яшчэ не азнаёміўся з імператарскім вердыктам, ён раскажа табе пра яго змест і прааналізуе яго табе» (Ibid.). Апошняя фраза, як уяўляецца, падкрэслівае пасіўную ролю брата Сімаха.

Такім чынам, перамяшчэнне фіксацыі ацэнкі дзеянняў імператарскай улады з пісьмовай формы у вусную дазваляе выканаць асноўную умову адкрытай інфармацыі – выяўленне лаяльнасці да дзяржаўнай улады.

У выніку праведзенага аналізу перапіскі Сімаха з Аусоніем, Пробам і Прэтэкстатам можна зрабіць выснову пра агульную накіраванасць познеантычнай нехрысціянскай ментальнасці. З улікам таго, што адной з функцый менталітэту з'яўляецца адаптацыя чалавека у сацыяльным асяроддзі, можна выказаць наступныя меркаванні:

1) нехрысціянская частка рымскай арыстакратыі успрымала сябе у якасці «эліты эліт роду чалавечага»;
2) яе асноўнай мэтай была унутраная кансалідацыя дзеля супрацьстаяння хрысціянскаму асяроддзю, якое пастаянна пашырала свой уплыў;
3) замкнёнасць у абмежаваным коле прывяла арыстакратыю да стану вымірaючай касты.

[1] Гл.: Howe G. Fasti sacerdotum P.R. Publicorum aetatis imperatoriae. Lipsiae, 1904. P. 23, 31, 38.
[2] Гл.: Symmaque. Lettres. T. 1 (Livres I–II) / Texte et, trad. et comm. par J.P. Callu. Paris, 1972. P. 107–116.
[3] Гл.: McGeachy J.A. Quintus Aurelius Symmachus and the Senatorial Aristocracy of the West. Chicago, 1942. P. 18.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm